**З гісторыі прадпрыемстваў горада**

# «САЛЕА-Кобрын»: стаўка на экспарт і мадэрнізацыю

***Да 80-годдзя з часу заснавання ААТ «САЛЕА-Кобрын»***

***Б і б л і я г р а ф і ч н ы   п а к а з а л ь н і к***

**Кобрын**
**2020**

ББК 91.9: 34.4(4Беи)
С 16

**Складальнік:**

***С. Д. Курачук*** – галоўны бібліёграф аддзела абслугоўвання і інфармацыі цэнтральнай раённай бібліятэкі ДУК «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

С 16 **«САЛЕА-Кобрын»: стаўка на экспарт і мадэрнізацыю** : бібліяграфічны паказальнік да 80-годдзя з часу заснавання ААТ «САЛЕА-Кобрын» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. Святлана Курачук. – Кобрын : Цэнтральная раённая бібліятэка, 2020. – 40 с. - (З гісторыі прадпрыемстваў горада).

ББК 91: 34.4(4Беи))

© Афармленне Кобрынская
цэнтральная раённая
бібліятэка, 2020

# АД СКЛАДАЛЬНІКА

Бібліяграфічны паказальнік «САЛЕА-Кобрын»: стаўка на экспарт і мадэрнізацыю» з серыі «З гісторыі прадпрыемстваў горада» выдадзены да 80-годдзя з часу заснавання ААТ «САЛЕА-Кобрын» (Кобрынскага рамонтнага завода, ААТ «Гідрамаш»).

2020 год стаў юбілейным для аднаго са старэйшых прадпрыемстваў нашага горада і раёна, буйнейшага прадпрыемства рэгіёна ў галіне машынабудавання, якое змагло за апошнія гады выйсці на якасна новы ўзровень сваёй дзейнасці.

Ветэран прамысловасці Кобрыншчыны «САЛЕА-Кобрын» адлік сваёй біяграфіі вядзе ад маленькіх майстэрняў па рамонце машын і сельскагаспадарчай тэхнікі, створаных 11 лютага 1940 года. Сёння гэта сучаснае прадпрыемства - адно з вядучых аб'ектаў прамысловай інфраструктуры Кобрына, якое займае трывалыя пазіцыі на рынку збыту і будуе грандыёзныя планы. На працягу ўсёй сваёй гісторыі завод не раз кардынальна змяняў накірунак дзейнасці і на кожным этапе, дзякуючы працавітасці, мэтанакіраванасці і прафесіяналізму калектыву, паспяхова распрацоўваў і ўкараняў новыя віды прадукцыі. Гісторыя ААТ «САЛЕА-Кобрын» працягваецца, час упісвае ў яе ўсе новыя і новыя старонкі.

Бібліяграфічны паказальнік мае наступную структуру:

Ад складальніка;

Гісторыка-эканамічны нарыс:

*Вытокі: ад майстэрні да завода*

*Дзень сённяшні: новы профіль завода*

*Каманда, накіраваная на вынік*;

Спіс крыніц;

Спіс перыядычных выданняў, матэрыялы з якіх уключаны ў паказальнік.

Выданне прадстаўляе каля 200 крыніц. Уключае артыкулы з перыядычных выданняў, пачынаючы з 1964 года. Творы друку згрупаваны па відах: кнігі, брашуры, главы, раздзелы з кніг, энцыклапедычныя артыкулы; часопісныя і газетныя артыкулы; найбольш стабільныя электронныя рэсурсы. Кнігі размешчаны ў алфавіце аўтараў, назваў кніг, артыкулы – па гадах у зваротнай храналогіі, унутры года – у алфавіце аўтараў, загалоўкаў. Для раскрыцця зместу пры неабходнасці да запісаў даюцца кароткія даведачныя анатацыі.

Даведачны апарат прадстаўлены алфавітным спісам перыядычных выданняў, матэрыялы з якіх уключаны ў паказальнік.

У выданні прадстаўлены ілюстрацыйны матэрыял, фотаздымкі розных гадоў.

Выдадзены ў Год малой радзімы, паказальнік адрасаваны ўсім, хто займаецца вывучэннем роднага краю, цікавіцца яго гісторыяй, эканомікай, культурай.

# ГІСТОРЫКА-ЭКАНАМІЧНЫ НАРЫС

## *Вытокі: ад майстэрні да завода*

Нараджэнне Кобрынскага рамонтнага завода звязана з датай у гісторыі Беларусі - уз’яднаннем Заходняй Беларусі з БССР. На былых памешчыцкіх землях заходніх абласцей пачалі стварацца саўгасы і калгасы, на палях паявілася тэхніка. Для забеспячэння яе бесперабойнай работы патрэбна была рамонтная база. У верасні 1939 года ЦК партыі і СНК СССР прынялі рашэнне аб будаўніцтве ў вызваленых абласцях рамонтных прадпрыемстваў.

Перадваенны 1940 год – пачатковы ў біяграфіі ААТ «САЛЕА-Кобрын». **11 лютага 1940 года** ў Кобрыне на тэрыторыі, якая раней прыналежыла купцу Гібуту, была створана машынна-трактарная майстэрня (МТМ). Для новага прадпрыемства рашэннем райвыканкама перадалі два цагляныя дамы, драўляны хлеў па вуліцы Савецкай, а таксама прыватныя майстэрні па вуліцы Чырвонаармейскай і плошчы Камсамольцаў, акумулятарную майстэрню па вуліцы Кастрычніцкай. На гэтай базе і пачала дзейнічаць у горадзе МТМ для рамонту калгаснай тэхнікі.

Да пачатку Вялікай Айчыннай вайны, у апошні мірны перадваенны год, было завершана будаўніцтва першай чаргі завода, здадзены ў эксплуатацыю машынна-сілавое, маторнае і разборна-зборнае аддзяленні, механічны цэх, выпрабавальная станцыя, склады, заводакіраўніцтва. Майстэрня пачала праводзіць рамонт трактарных рухавікоў, агрэгатаў і аўтамабіляў калгасаў, саўгасаў і асабістых гаспадарак. У штаце

было 75 работнікаў, пры неабходнасці прыцягваліся і сезонныя рабочыя.

Аднак мірная праца людзей была перапынена Вялікай Айчыннай вайной. Калі вораг захапіў Кобрын, кіраванне майстэрні было эвакуіравана, частка калектыву, уключаючы першага дырэктара Іосіфа Георгіевіча Стырыковіча, пайшлі на фронт. У гады акупацыі ў майстэрні рамантавалі варожую тэхніку. У час адступлення гітлераўцы вывезлі абсталяванне і электрастанцыю, узарвалі машынна-сілавое аддзяленне.

Пасля вызвалення горада ад фашысцкіх захопнікаў пачалося аднаўленне разбуранай гаспадаркі. **5 верасня 1944 года** машынна-трактарная майстэрня распачала сваю работу. Усё даводзілася адбудоўваць нанава, але паступова вытворчасць адраджалася. Рабочыя (25 чалавек) адбудавалі электрастанцыю, якая забяспечвала электраэнергіяй горад, дапамагалі ў зварачных работах на аднаўленні разбуранага моста цераз Мухавец. У 1945 годзе дзейнічаў толькі адзін механічны цэх. Аўтамашыны і маторы не рамантаваліся.

У снежні 1946 года быў уведзены ў строй чыгуналіцейны ўчастак па вуліцы Чырвонаармейскай. Рамонтнікі распачалі аднаўленне трактарных рухавікоў. У 1947 годзе стаў дзейнічаць маторны цэх. У тым жа годзе было адрамантавана 20 аўтамабіляў ГАЗ ММ і 41 аўтарухавік.

Год ад году майстэрня павялічвала свае магутнасці. Невыпадкова **6 кастрычніка 1947 года** МТМ рэарганізавана ў міжраённую майстэрню капітальнага рамонту (ММКР). У 1948 годзе яна мела тры ўчасткі: механічны, ліцейны і маторны, дзе ажыццяўляўся капітальны рамонт аўтамабільных і трактарных рухавікоў, пазней быў асвоены выпуск калёс для счэпаў С-11, пультаў для прасушкі збожжа, пярэдніх калёс для трактароў і інш.

**20 жніўня 1949 года** ММКР рэарганізавана ў рамонтны завод, якому былі перададзены памяшканні і пабудовы былой Кобрынскай машынна-трактарнай станцыі: галоўны рамонтны корпус, гараж, кацельня, воданапорная вежа і інш. Яны былі пераабсталяваны пад вытворчыя плошчы аўтарамонтнага прадпрыемства.

З 1950 па 1960 год пад кіраўніцтвам дырэктара завода Цімафея Астапцова ў дасканаласці быў засвоены рамонт аўтамабільных і трактарных рухавікоў.

З 1959 года завод праводзіў капітальны рамонт аўтамабіляў ГАЗ-51, іх рухавікоў, пярэдніх і задніх мастоў, каробак перадач, рулявога кіравання. Было адрамантавана 43 машыны. У той час на заводзе працавала 219 чалавек. Працягвалася асваенне новых відаў прадукцыі: стэндаў для рамонту абсталявання жывёлагадоўчых ферм, эстакад для разборкі і зборкі аўтатрактарных рухавікоў. Гэтыя вырабы пастаўляліся ў саюзныя рэспублікі краіны, асобныя ішлі на экспарт.

Новым этапам развіцця сталі **60-70-я гады**. У 1967 годзе пабудаваны новы ліцейны ўчастак з вытворчай плошчай больш за 1100 $м^2$, які даваў штогод 1000 тон чыгуннага ліцця. Кабрынчане актыўна пастаўлялі сваю прадукцыю па ўсёй рэспубліцы.

Кожны год прыносіў з сабой новыя ўведзеныя ў эксплуатацыю аб'екты вытворчай базы. Да пачатку 70-х гадоў на заводзе ўжо працавалі 890 чалавек. Праз цэхі рамонтнага прадпрыемства прайшлі звыш 1700 аўтамабіляў ГАЗ рознай мадыфікацыі, больш 5500 рухавікоў да іх. Вытворчасць валавай прадукцыі ў параўнанні з 1960 годам вырасла амаль у 5 разоў.



*В'етнамская дэлегацыя на кобрынскім заводзе «Гідрамаш» 1968 год*

Рух наперад працягваўся і ў **80-я гады.** Завод атрымліваў узнагароды ўсесаюзнага значэння, а з канвеераў тысячамі сыходзілі культыватары, буксіры, эстакады і шматлікія іншыя вырабы, якія разыходзіліся па ўсёй краіне.

У сувяі з тым, што ў рэспубліцы востра паўстала пытанне капітальнага рамонту аўтамабіляў ГАЗ-52 і ГАЗ-53, у 1972 годзе было прынята рашэнне аб спецыялізацыі рамонтных прадпрыемстваў. Завод пачаў спецыялізавацца на рамонце грузавых аўтамабіляў ГАЗ усіх мадыфікацый. Пад кіраўніцтвам Мікалая Аляксандравіча Міхалькова пачалася рэканструкцыя прадпрыемства, якая закончылася ў снежні 1976 года. У ходзе рэканструкцыі былі ўзведзены галоўны вытворчы (плошча 13 тыс. м$^2$) і 4-павярховы адміністрацыйна-бытавы карпусы, кампрэсарная і кацельня, якая забяспечыла цяплом і гарачай вадой шэраг прадпрыемстваў і жылых дамоў горада. З уводам галоўнага корпуса было вырашана пытанне мыйкі і ачысткі аўтамабіляў перад разборкай метадам пагружэння ў ванны ў растворы павярхова-актыўных рэчываў. Укаранёна 1000 пагонных метраў падвясных канвеераў, зборачны канвеер на 14 рабочых пастоў па тыпу Горкаўскага аўтазавода, фарбавальнае аддзяленне.

З 1976 года завод пачаў цесна супрацоўнічаць з Мінскім трактарным заводам, для якога штогод выраблялі па 60-70 тысяч штук буксірных прылад да трактара МТЗ-80.

У 1978 годзе на пасаду дырэктара Кобрынскага рамонтнага завода быў прызначаны Георгій Фёдаравіч Коўган. За 18 гадоў працы Георгія Фёдаравіча на кіраўнічай пасадзе калектыў прадпрыемства дасягнуў немалых поспехаў. Паралельна з мадэрнізацыяй і павелічэннем магутнасці завода раслі і яго вытворчыя паказчыкі. Колькасць працаўнікоў вырасла да 1080 чалавек. У сярэдзіне 80-х прадпрыемства працавала ў тры змены, і вытворчыя магутнасці былі загружаны на ўсе 100 працэнтаў.

Рост і развіццё завода інтэнсіўна працягваецца ў 1983-1985 гадах: будуюцца і ўводзяцца ў строй дзеючых новыя цэхі - кавальска-тэрмічны, сельгасмашын, участак стальнога дакладнага ліцця па выплаўляемых мадэлях. У гэты ж час асвойваецца выраб цэлага шлейфа сельгасмашын: культыватараў КШТ-8, стоек чызельных культыватараў для глыбокага безадвальнага рыхлення глебы, якія раней куплялі ў Даніі, і шмат інш. Тэхніка кобрынскіх майстроў накіроўвалася земляробам, якім яна была вельмі патрэбна.

Вялікая ўвага на заводзе ўдзялялася сацыяльным пытанням. У 1973 годзе быў пабудаваны 60-кватэрны дом, у 1978 - 48-кватэрны, праз тры гады - дзіцячы сад на 280 месц, а яшчэ праз год - інтэрнат для маласямейных на 395 чалавек. У 1982-1985 гадах 65 сем'яў палепшылі свае жыллёвыя ўмовы шляхам долевага ўдзелу ў будаўніцтве жылых дамоў. У 1989 годзе быў узведзены 65-кватэрны дом на сродкі завода, а ў 1990 годзе пачалося будаўніцтва 70-кватэрнага дома жыллёва-будаўнічага кааператыва. На тэрыторыі завода быў пабудаваны

прадуктовы магазін, сталовая на 180 пасадачных месц, кулінарны магазін.

Калектыў рамонтнага завода шмат разоў выходзіў пераможцам у спаборніцтве, неаднаразова яму прысуджаліся пераходныя сцягі. Напрыклад, у 1985 годзе завод тройчы выходзіў пераможцам спаборніцтва сярод калектываў Дзяржкамсельгастэхнікі БССР і СССР, заслужана атрымліваў пераходныя Чырвоныя сцягі і грашовыя прэміі. На той час на прадпрыемстве працавала 1100 чалавек. І хоць сёння многія скептычна адносяцца да паказчыкаў такога роду, гэта былі сапраўдныя дасягненні працаўнікоў, якія сумленна і старанна адносіліся да выканання дзяржауных планаў.

У 1987 годзе рамонтны завод паралельна з дзеючай вытворчасцю пачаў наладжваць выраб гідраўлічных цыліндраў. Ужо ў студзені 1988 года першыя гідрацыліндры КС- 25661К да аўтакрана «Іванавец» былі выраблены. Упаследку завод асвойвае вялікую наменклатуру гідрацыліндраў, таму з'явіліся намёткі абсталяваць вялікі спецыялізаваны цэх па іх вырабу, аднак гэтыя планы парушыла перабудова.

Калі аграрны сектар эканомікі апынуўся ў цяжкім фінансавым становішчы і аб’ём заказаў на аднаўленне аўтамабіляў рамонтнаму заводу рэзка ўпаў, цэхі не засталіся без работы. Стараннем завадчан усталяваўся новы накірунак вытворчасці, які ўтрымаў яе на ўзроўні 70% да ранейшага аб’ёму. Выраб цыліндраў не прыпыняўся і тады, калі паўсюдна назіраўся спад вытворчасці. Гэта пазбавіла калектыў завода ад прастояў, а пазней дазволіла нарошчваць выраб новай прадукцыі.

# *Дзень сённяшні: новы профіль завода*



З развалам Савецкага Саюза і пераходам на эканоміку рынкавых адносін змянілася і жыццё прадпрыемства. Змяніўся статус, форма ўласнасці завода.

З **1 мая 1997 года** гэта адкрытае акцыянернае таварыства «Завод гідраўлічнага машынабудавання «Гідрамаш». Пад кіраўніцтвам дырэктара Эдуарда Карлавіча Янкоўскага «Гідрамаш» вырашаў складанейшыя задачы нарошчвання вытворчасці канкурэнтаздольнай прадукцыі. Прадпрыемства стала галаўным і адзіным у Беларусі заводам па выпуску гідрацыліндраў розных мадыфікацый з поўным цыклам вытворчасці для ўсяго комплексу народнай гаспадаркі Беларусі і краін СНД. Асвоена больш 300 тыпаў гідрацыліндраў, без якіх не абыходзіліся МАЗ, МТЗ, іншыя заводы, сельгас-прадпрыемствы. Дастаткова сказаць, што аўтамабілі МАЗ, трактары МТЗ, аўтакраны, экскаватары і франтальныя пагрузчыкі, дарожна-будаўнічая тэхніка і сельгасмашыны, а таксама розныя маніпулятары, тэхналагічнае абсталяванне, якія камплектаваліся гідрацыліндрамі «Гідрамаша», эксплуатуюцца ў многіх краінах свету. Вытворчасць гідрацыліндраў дазволіла

сельскагаспадарчаму машынабудаванню камплектаваць і падтрымліваць у спраўным стане розныя віды тэхнікі, пазбавіла Беларусь у некаторым плане залежнасці ад краін-імпарцёраў. Асноўныя спажыўцы прадукцыі «Гідрамаша» — Мінскія аўтамабільны і трактарны заводы, Гомсельмаш, Лідсельмаш і інш. На заводзе захавалі вытворчасць седлавых прыстасаванняў для Мінскага аўтамабільнага завода, якія не выробляюцца ў такім выглядзе ў краінах СНД.

У 2010 годзе дырэктарам ААТ «Гідрамаш» прызначаны Сяргей Раманавіч Валадзько, якога ў ліпені 2013 года змяніў Аляксандр Ігаравіч Казакоў.

У **2014 годзе** ААТ «Гідрамаш» змяніў фірменную назву на ААТ «САЛЕА-Кобрын» у сувязі з уваходжаннем у холдынг «САЛЕА».

САЛЕО
ОАО «САЛЕО - Кобрин»

З 2017 года па кастрычнік 2019 года прадпрыемствам кіраваў Аляксандр Васільевіч Дзямідовіч, які потым стаў генеральным дырэктарам кампаніі холдынгу «САЛЕА». З 2019 года прадпрыемствам кіруе Сяргей Міхайлавіч Кавалевіч.

Сёння завод працуе з прыбыткам, і ў яго ёсць вялікі партфель заказаў. У апошнія гады праведзена цэнтралізацыя і аптымізацыя вытворчасці, змена тэхналагічных патокаў, распрацоўка новых відаў гідрацыліндраў.

Прафесіяналізм канструктарскай і тэхналагічнай службаў




прадпрыемства дазваляюць пашыраць асартымент прадукцыі. Наменклатура вырабаў складае больш 1000 гідрацыліндраў розных мадыфікацый. На кобрынскіх гідрацыліндрах і седлавых прыладах працуюць практычна ўсе аўтамабілі МАЗ, трактары МТЗ, якія пастаўляюцца ў шматлікія краіны свету, тэхніка «Амкадор». Завод вырабляе гідрацыліндры для сельгасмашын, аўтамабільнай тэхнікі, для камунальных службаў. Адно з перспектыўных кірункаў сёння - выраб цыліндраў для будаўнічай і лесанарыхтоўчай тэхнікі, а таксама розных дарожных машын. За 2019 год атрымалася павялічыць аб'ём вытворчасці ў сярэднім на 5%.

Кобрынскія гідрацыліндры адваявалі сваю нішу на рынку



і сталі запатрабаванымі ў Беларусі і за яе межамі. Стаўка зраблена на высокую якасць вырабаў. Прадукцыя ААТ «САЛЕА-Кобрын» адпавядае самым высокім патрабаванням сённяшняга дня. Працоўнаму калектыву атрымалася апярэдзіць канкурэнтаў па выпуску гідрацыліндраў з Мазыра, Магілёва, Барысава, Жодзіна і нават Латвіі.

На прадпрыемстве заўсёды вялася і вядзецца работа па абнаўленні абсталявання. Па магчымасці частка старога абсталявання мадэрнізуецца для вытворчасці новай прадукцыі.




Завод набывае новую тэхніку ад вядучых сусветных вытворцаў. Так, за апошнія гады былі закуплены тры станкі з лічбавым праграмным упраўленнем «Multiplex 6200-II» японскай фірмы «MAZAK», камерная электрапечка KG 290/1200 «Termoskale».

Вытворча-тэхнічная база ААТ «САЛЕА-Кобрын» папаўняецца сучасным імпартным абсталяваннем. Абсталяванне прадпрыемства адаптавана да існуючых сучасных стандартаў у вытворчасці і патрабаванняў эканоміі і беражлівасці. Яно дазволяе істотна павялічыць аб’ёмы гатовай прадукцыі, якая карыстаецца павышаным попытам не толькі на ўнутраных рынках.

# *Каманда, накіраваная на вынік*

Наяўнасць вытворчых магутнасцяў і пашырэнне наменклатуры прадукцыі - гэта важны, але не галоўны складальнік паспяховага прадпрыемства. Вызначальным фактарам поспеху з'яўляецца калектыў прафесійных работнікаў, здольных вырашаць задачы любой складанасці.

Важны накірунак дзейнасці адміністрацыі завода - паляпшэнне ўмоў работы працоўных на вытворчасці і пашырэнне гарантый для





супрацоўнікаў на прадпрыемстве. Уважлівыя адносіны да людзей з'яўляюцца залогам паспяховага функцыянавання вытворчасці і ствараюць умовы для якаснай і эфектыўнай працы.

Сёння калектыў ААТ «САЛЕА-Кобрын» налічвае 420 чалавек. Асноўнай характарыстыкай кадраў з'яўляецца накіраванасць на вынік і ўменне вырашаць пастаўленыя задачы. Высокая эфектыўнасць працы прадпрыемства дасягаецца за кошт спалучэння ведаў і навыкаў вопытных работнікаў і энтузіязму маладых супрацоўнікаў.

На багатых традыцыях завода выгадавана не адна працоўная дынастыя. На ААТ «САЛЕА-Кобрын» склалася адзінаццаць працоўных дынастый. Пераемнасць традыцый,

дачыненне да агульнай справы і высокая адказнасць - менавіта гэтыя рысы характэрны для тых, хто з пакалення ў пакаленне застаецца верны сваёй прафесіі.

Імёны і фатаграфіі лепшых супрацоўнікаў прадпрыемства сёння знаходзяцца на дошцы пашаны, а іх вопыт з'яўляецца асновай нязменнай пераемнасці пакаленняў, якой адрозніваецца любы сапраўдны калектыў.

За восем дзесяткаў гадоў калектыў ААТ «САЛЕА-Кобрын» заўсёды крочыў у нагу з жыццём, працаваў натхнённа, творча. Тут захаваўся надзейны касцяк выдатных майстроў сваёй справы, адданых прадпрыемству.

Лепшыя традыцыі жывуць і памнажаюцца…



**Сёння ААТ «САЛЕА-Кобрын» з'яўляецца ўнікальным прадпрыемствам як у Рэспубліцы Беларусь, так і на еўрапейскай індустрыяльнай прасторы. Асноўнымі рынкамі збыту прадукцыі з'яўляюцца Беларусь, Расія, Казахстан, Літва, Украіна. Прадпрыемства дынамічна развіваецца і займае цвёрдыя пазіцыі ў машынабудаўнічай галіне Рэспублікі Беларусь.**

**Гісторыя ААТ «САЛЕА-Кобрын» працягваецца. Час упісвае ў яе ўсе новыя і новыя старонкі...**

# СПІС КРЫНІЦ

**Адкрытае** акцыянернае таварыства «Завод гідраўлічнага машынабудавання» // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 407-409. – (З гісторыі прадпрыемстваў Кобрына).

**Дякулич, В. И**. Кобринский завод гидравлического машиностроения / В. И. Дякулич // Республика Беларусь : энциклопедия : в 7 т. – Минск, 2007. – Т. 4. – С. 100.

**Кобрынскі** рамонтны завод // Беларуская ССР : кароткая энцыклапедыя : у 5 т. – Мінск, 1979. – Т. 2. – С. 348.

**Кобринский** ремонтный завод // Белорусская ССР : краткая энциклопедия : в 5 т. – Минск, 1979. – Т. 2. – С. 285.

**Кобринский** завод гидравлического машиностроения // Регионы Беларуси : энциклопедия. - В 7 т. Т.1 Брестская область : в 2 кн. – Минск, 2009. – Кн. 1. – С. 470-471.

**Кобринский** ремонтный завод : буклет. – Минск, 1987.

**Предприятия** Кобринского региона. ОАО «Завод гидравлического машиностроения» // Инвестиционные возможности Брестской области. Кобринский район. – Брест, 2004. – С. 30.

**Региональные** проблемы развития инфраструктуры и межотраслевых производств. – Минск : Наука и техника, 1985.

См. на с. 144.

**Сегодня** в книге – завтра в цехе : из опыта работы книголюбов Кобринского ремонтного завода. – Минск : Полымя, 1983. – 14 с. : ил.

**Фирмы** и предприятия города Кобрина. Открытое акционерное общество «Гидромаш» // Кобрин : информационно-хозяйственный справочник. - Międzyrzec Podlaski, 1999. – С. 45.

**Шокун, Р. В.** История создания и развития Кобринского ремонтного завода (1939 – конец 1980-х гг.) / Р. В. Шокун // Историческая наука в XXI веке: достижения, проблемы, перспективы : сборник материалов региональной студенческой научно-практической конференции, Брест, 26–27 апреля 2013 г. / БрГУ им. А. С. Пушкина. - Брест, 2013. - С. 107–109.

**Белов, Д.** ОАО «Салео-Кобрин»: в гармонии технологий и мастерства / Дмитрий Белов // Кобрынскі веснік. - 2020. — 15 февраля. — С. 3.

**ОАО «САЛЕО** - Кобрин» - 80 лет! // Кобрин-информ. – 2020. — 13 февраля (№ 7). — С. 2, 3.

**Демидович, А. В.** Завод — технический лицей / Александр Васильевич Демидович ; [беседовал] Сергей Семёнов // Брестский калейдоскоп. - 2019. - 6 февраля (№ 3). - С. 1.

**Елизарова, Ж.** Идти в ногу со временем / Жанна Елизарова // Кобрынскі веснік. - 2019. — 28 верасня. — С. 1, 2 : фот.

**Ковалевич** Сергей Михайлович — директор ОАО «САЛЕО-Кобрин» // Кобрынскі веснік. - 2019. — 2 лістапада. — С. 3 : фот.

**Александр** Васильевич Демидович — директор ОАО «САЛЕО-Кобрин» // Кобрынскі веснік. - 2017. — 19 красавіка. — С. 2.

А. В. Демидович утвержден на должность директора ОАО «САЛЕО-Кобрин».

**Бакун, Е.** С мыслью о будущем / Елена Бакун // Кобрынскі веснік. - 2017. — 19 красавіка. — С. 1.

О работе отдела конструкторского бюро ОАО «САЛЕО-Кобрин».

**Елізарава, Ж.** ААТ «САЛЕА-Кобрын»: прынцыпы, якія дапамагаюць заваяваць свет / Жанна Елізарава // Кобрынскі веснік. - 2017. — 23 верасня. — С. 1, 2.

Сення ААТ «САЛЕА-Кобрын» займае трывалыя пазіцыі на рынку збыту.

**Жук, Е.** 79 млн долларов — на кобринский проект / Елена Жук // Вечерний Брест. - 2017. — 23 августа. — С. 2.

ОАО «САЛЕО-Кобрин» получит международный кредит на реализацию масштабного проекта по модернизации производства.

**Савчук, М.** Модернизация — путь к стабильности / Маргарита Савчук // Кобрин-информ. - 2017. — 28 сентября. — С. 3.

О работе ОАО «САЛЕО-Кобрин».

**Сергеев, И**. Модернизация по-китайски / Иван Сергеев // Заря. - 2017. — 24 августа. — С. 2.

ОАО «САЛЕО-Кобрин» получит международный кредит на модернизацию производства.

**Белов, Д.** ОАО «САЛЕО-Кобрин» : достойные традиции, серьезные перспективы / Дмитрий Белов // Кобрынскі веснік. - 2016. — 24 верасня. — С. 3.

Накануне профессионального праздника - о работе ОАО «САЛЕО-Кобрин» рассказывает директор предприятия А. Казаков.

**Белов, Д.** ОАО «САЛЕО-Кобрин»: ставка - на экспорт и модернизацию / Дмитрий Белов // Кобрынскі веснік. – 2015. – 16 снежня. – С. 3.

В ОАО «Салео-Кобрин» ставка делается на экспорт и модернизацию.

**Казаков, А. И.** По пути модернизации / [Александр Игоревич Казаков ; беседовала] Маргарита Савчук // Кобрин-информ. - 2015. — 1 октября — С. 3.

**Логвинович, А**. Что год текущий нам готовит / Александр Логвинович ; фото Валерия Короля // Заря. - 2015. — 17 марта. — С. 5.

Из материалов пресс-конференции председателя облисполкома А. Лиса о проблемных предприятиях ОАО «САЛЕО-Кобрин», КИЗ «Ситомо» .

**Хокимова, А.** На первой передаче работают заводы, выпускающие продукцию для отечественного автопрома / Антонина Хокимова // Вечерний Брест. – 2015. – 10 апреля (№ 28). – С. 9.

**Годовой** отчет эмитента ценных бумаг за 2013 год. ОАО «Завод гидравлического машиностроения» // Звязда. - 2014. — 27 сакавіка. —С. 6.

**Жук, Е**. 200-миллиардная гарантия для «Гидромаша» / Елена Жук // Вечерний Брест. - 2014. — 16 июля. — С. 6.

**Казаков, А.** На финишной прямой в холдинг гидравлики / Александр Казаков ; [беседовала] Наталья Кондрашук // Кобрин-информ. – 2014. – 7 августа. – С. 3.

ОАО «Гидромаш» входит в состав холдинга «Салео».

**Казакова, А**. Женщина с мужской профессией / Анна Казакова // Кобрин-информ. - 2013. — 7 марта. — С. 3.

О сверловщице участка гидроцилиндров ОАО «Гидромаш» Раисе Козич.

**Казакоў, А.** «Гідрамаш»: развіццё па ўзыходзячай / Аляксандр Казакоў ; [гутарыў] Ігар Федаровіч // Кобрынскі веснік . - 2013. — 6 красавіка. — С. 2.

Гутарка з выконваючым абавязкі дырэктара ААТ «Гідрамаш» А. Казаковым.

**Мадэрнізацыя** - паэтапна // Кобрынскі веснік . - 2013. — 3 красавіка. — С. 1.

**Сідарук, І.** ААТ «Гідрамаш» пашырае вытворчасць / Ігар Сідарук ; фота аўтара // Кобрынскі веснік. - 2013.— 17 жніўня. — С. 2.

Прадукцыя, якую выпускае ААТ «Гідрамаш», канкурэнтаздольная не толькі на беларускім і расійскім рынках, але і ў краінах Еўропы.

**Сідарук, І.** Добры наладчык як музыкант / Ігар Сідарук ; фота аўтара // Кобрынскі веснік. - 2013.— 12 студзеня. — С. 3.

Пра Уладзіміра Іванавіча Кузьмука, наладчыка ўчастка гідрацыліндраў № 2.

**Сідарук, І.** Новае абсталяванне працуе без збояў / Ігар Сідарук ; фота аўтара // Кобрынскі веснік. - 2013.— 21 жніўня. — С. 2.

Чарговым крокам на шляху мадэрнізацыі ў ААТ «Гідрамаш» стала закупка і ўсталяванне станкоў з лічбавым праграмным кіраваннем.

**Федаровіч, І.** ААТ «Гідрамаш»: ствараецца яшчэ адзін участак / Ігар Федаровіч // Кобрынскі веснік. - 2013.— 21 верасня. — С. 2.

Паступова перабудоўвае сваю вытворчую дзейнасць ААТ «Гідрамаш».

**Бялоў, Д**. Зрадніўся з заводам і горадам / Дзмітрый Бялоў // Кобрынскі веснік. - 2012. - 21 ліпеня. - С. 10.

30 гадоў Віктар Русак працуе на ААТ «Гідрамаш».

**Важнейшим** из искусств является... машиностроение // Народная газета. - 2012. - 13 лістапада. - С. 7.

**Валадзько, С.** «На рынку гідрацыліндраў - велізарныя перспектывы» / [Сяргей Валадзько ; запісаў] Ігар Сідарук // Кобрынскі веснік. - 2012. - 29 верасня. - С. 3.

**Валадзько, С.** «Па суадносінах «Кошт-якасць» мы ў Беларусі фактычна не маем канкурэнтаў» / Сяргей Валадзько // Звязда. - 2012. - 28 жніўня. - С. 4.

**«Гидромаш»** приобрёл современное импортное оборудование // Кобрин-информ. - 2012. - 16 февраля. - С. 2.

**Інфармкур'ер:** мясцовыя навіны // Кобрынскі веснік. - 2012. - 18 студзеня. - С. 1.

В ОАО «Гидромаш» был закуплен и введён в эксплуатацию новый импульсный модульный выпрямитель шведской фирмы.

**Казакова, А.** Тепло холодного металла : ко Дню работников машиностроительной промышленности / Анна Казакова // Кобрин-информ. - 2012. - 27 сентября. - С. 2.

**Липницкий, И.** Работа по-крупному / Иван Липницкий // Заря. – 2012. – 6 сакавіка. – С. 3.

Кобринский завод гидравлического машиностроения входит в состав холдинга «Автокомпоненты».

**Мельнік, Р.** З «Гідрамашам» назаўжды / Раман Мельнік // Кобрынскі веснік. - 2012. - 10 кастрычніка. - С. 3.

Армія ветэранаў працы завода – адна з самых вялікіх на Кобрыншчыне.

**Пучык, С.** «Атмасфера для росту самая спрыяльная» / Сяргей Пучык // Кобрынскі веснік. - 2012. - 14 сакавіка. - С. 2.

**Федаровіч, І**. І да поўнай аўтаматызацыі / Ігар Федаровіч // Кобрынскі веснік. - 2012. - 10 сакавіка. - С. 9.

Вытворча-тэхнічная база ААТ «Гідрамаш» папоўнілася сучасным імпартным абсталяваннем.

**Аверкин, М.** «Никогда не хотелось поменять место жительства» / Михаил Аверкин // Кобрынскі веснік. - 2011. - 16 ліпеня. - С. 3.

**Валадзько, С.** Адказнасць і якасць, правераныя часам / Сяргей Валадзько ; [гутарыў] Ігар Федаровіч // Кобрынскі веснік. - 2011. - 24 верасня. - С. 2.

**Володько, С.** Гидроцилиндры - под заказ / С. Володько ; [беседовала] Анна Гром // Кобрынскі веснік. - 2011. - 26 лютага. - С. 3.

**Федарович, И.** Энергосбережению - пристальное внимание / Игорь Федарович // Кобрынскі веснік. - 2011. - 1 чэрвеня. - С. 3.

**Бялоў, Д**. Ідэі, якія працуюць / Дзмітрый Бялоў // Кобрынскі веснік. - 2010. - 26 чэрвеня. - С. 2.

ААТ «Гідрамаш» - завод, які славіцца развіццём рацыяналізатарскай думкі.

**Рекуц, С.** Наша ниша / Сергей Рекуц // Заря. - 2010. - 25 сентября. - С. 3.

Кобринский «Гидромаш» начал выпускать гидроцилиндры.

**Васюк, Н.** Капитал в завтрашний день / Наталья Васюк // Кобрин-информ. - 2009. - 25 июня. - С. 3.

**«Внимание** и поддержка ветеранам необходимы» // Кобрынскі веснік. - 2009. - 18 сакавіка. - С. 3.

**Каникулы** не пошли на пользу // Вечерний Брест. - 2009. - 21 января. - С. 1.

**Мельнік, Р**. Будучыня ў руках у моладзі / Раман Мельнік // Кобрынскі веснік. - 2009. - 2 мая. - С. 2.

На ААТ «Гідрамаш» сёння працуе каля 40 маладых спецыялістаў.

**Рекуц, С.** В погоне за прошлым годом / Сергей Рекуц // Заря. – 2009. – 26 сентября. – С. 1-3.

**Белов, Д.** «Торнадо» приносит прибыль / Дмитрий Белов // Кобрынскі веснік. - 2008. - 17 мая. - С. 2.

Основные направления сбыта продукции ОАО «Гидромаш» - такие промышленные гиганты, как МТЗ, «Гомсельмаш», «Лида-Агромаш».

**Максимчик, А**. На основе технического прогресса / Алексей Максимчик // Кобрынскі веснік. - 2008. - 27 верасня. - С. 3.

**Рудковский, А.** От ремонтных мастерских до уникального производства / Александр Рудковский // Народная газета. - 2008. - 6 жніўня. - С. 14.

ОАО «Гидромаш» - ведущее предприятие страны по производству гидроцилиндров.

**Шевченко, А.** ОАО «Гидромаш»: секреты успеха / Алла Шевченко // Кобрин-информ. - 2008. - 25 сентября. - С. 2.

**Юркевич, Е.** «Атлант» принимал лучших / Елена Юркевич // Заря. - 2008. - 19 февраля. - С. 3.

В областном туре республиканского конкурса профессионального мастерства среди молодых токарей и слесарей принял участие рабочий ОАО «Завод гидравлического машиностроения».

**40 (!) видов** рыбы и морепродуктов // Кобрынскі веснік. - 2008. - 5 студзеня. - С. 2.

В бывшем магазине ОАО «Гидромаш» в канун Нового года открылась для кобринчан уникальная торговая точка.

**Максимчик, А.** Зарубежный рынок близок / Алексей Максимчик // Кобрынскі веснік. - 2007. - 14 сакавіка. – С. 2.

Кобринские цилиндры пользуются спросом в России, Украине, Прибалтике, Польше, Вьетнаме.

**Мельнік, Р.** Не збаўляй тэмпу, «Гідрамаш» / Раман Мельнік // Кобрынскі веснік. – 2006. – 23 верасня. – С. 1.

**Пянко, А.** Стимулы и проблемы роста / А. Пянко // Кобрынскі веснік. – 2006. – 9 жніўня. – С. 2.

ОАО «Завод гидравлического машиностроения».

«**Гидромаш**» прошел сертификацию // Заря. – 2005. – 6 января. - С. 1.

«Гидромаш» прошел сертификацию менеджмента качества производства.

**Кобяк, Р.** Гидромаш добрался до Вьетнама / Р. Кобяк // Белорусская нива. – 2005. – 16 марта. – С. 3.

**Лучший** поставщик ПО «Гомсельмаш»// Кобрынскі веснік. – 2005. – 24 снежня. - С. 1.

Лучший поставщик ПО «Гомсельмаш» - Кобринский ОАО «Завод гидравлического машиностроения».

**Новые** заказы для «Гидромаша» // Заря. - 2005. - 19 февраля. – С. 2.

Кобринский завод «Гидромаш» отметил свое 65-летие.

**ОАО «Гидромаш**» – 65 // Кобрин-информ. – 2005. – 17 февраля. – С. 2.

**Пянко, А.** Время мастеров / Алексей Пянко // Кобрынскі веснік. – 2005. – 24 верасня. - С. 2.

О сверловщике ОАО «Завод гидравлического машиностроения» Викторе Русаке, токаре Сергее Подкасике.

**Пянко, А**. Не бояться доверять молодым / Алексей Пянко // Кобрынскі веснік. – 2005. – 25 чэрвеня. – С. 1.

**Пянко, А.** Устойлівы на віражах / Аляксей Пянко // Кобрынскі веснік. – 2005. – 23 ліпеня. – С. 2.

З гісторыі ААТ «Завод гідраўлічнага машынабудавання».

**Савчук, М.** Как заработать миллиард знают в ОАО «Гидромаш» / М. Савчук // Кобрин-информ. – 2005. – 24 февраля. – С. 2.

**Пянко, А.** Главная политика / Алексей Пянко // Кобрынскі веснік. – 2004. – 28 жніўня. – С. 2.

**Пянко, А.** Системный подход / Алексей Пянко // Кобрынскі веснік. – 2004. – 26 мая. – С. 2.

**Шапран, Ю.** Адрес наш - «Гидромаш» / Юрий Шапран // Вечерний Брест. - 2004. – 25 февраля. – С. 6.

**Дащук, В.** Обыкновенное чудо «Гидромаша» / В. Дащук // Кобрынскі веснік. – 2002. - 27 липеня. – С. 6.

**О некоторых** вопросах совершенствования структуры управления организациями в агропромышленном комплексе : постановление Совета Министров Республики Беларусь, 8.06.2002 г. № 870 // Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь. - 2002. - 11июля (№ 77). - С. 40-44.

В т. ч. о передаче ОАО «Завод гидравлического машиностроения» г. Кобрин из Министерства сельского хозяйства и продовольствия в управление Министерства промышленности.

**Пянко, А.** Канкурэнцыя абумоўлена рынкам / Аляксей Пянко // Кобрынскі веснік. – 2001. – 23 мая. – С. 2.

**Пянко, А.** Маладзее «Гідрамаш» / Аляксей Пянко // Кобрынскі веснік. – 2001. – 10 студзеня. – С. 3.

**Пянко, А.** Партнёрства ўзаемнае, выгаднае / Аляксей Пянко // Кобрынскі веснік. – 2001. – 31 сакавіка. – С. 2.

**Пянко, А.** Гідрамашу – 60 / Аляксей Пянко // Кобрынскі веснік. – 2000. – 23 лютага. – С. 3.

**Пянко, А.** Расці і развівацца – іншага не дадзена : Кобрынскаму заводу гідраўлічнага машынабудавання – 60 гадоў / А. Пянко // Кобрынскі веснік. – 2000. – 9 лютага. – С. 1, 2.

**Мазы** с кобринской деталью // Заря. – 1999. – 23 февраля. – С. 3.

Кобринский «Гидромаш» поставляет гидроцилиндры «МАЗу».

**Пянко, А.** Адметны профіль «Гідрамаша» / Аляксей Пянко // Кобрынскі веснік. – 1999. – 16 студзеня. – С. 2 : фат.

**Пянко, А.** Рукатворныя асілкі «Гідрамаша» / Аляксей Пянко // Кобрынскі веснік. – 1999. – 25 верасня. – С. 2.

**Новый** профиль завода // Кобрынскі веснік. – 1998. – 17 чэрвеня. – С. 1, 2 : фат.

**Пянко, А.** У кампетэнтнасці – сіла / Аляксей Пянко // Кобрынскі веснік. – 1998. – 11 ліпеня. – С. 1.

Аб брыгадзіру электраманцёраў завода «Гідрамаш» Э. П. Ясюнасе.

**Кукса, М.** Под новой вывеской / Михаил Кукса // Заря. – 1997. – 7 октября. – С. 2.

**Пянко, А.** Дакладнасць – на мікроны / А. Пянко // Кобрынскі веснік. – 1997. – 17 снежня. – С. 2.

**Пянко, А.** Новы профіль завода / А. Пянко // Кобрынскі веснік. – 1997. – 10 снежня. – С. 2.

**Пянко, А.** Тайны завадскога двара / А. Пянко // Кобрынскі веснік. – 1997. – 18 чэрвеня. – С. 2.

**Пянко, А.** Формула выжывання / А. Пянко // Кобрынскі веснік. – 1997. – 3 мая. – С. 2.

**Пятроўская, М**. Валя, Валянціна / М. Пятроўская // Кобрынскі веснік. – 1997. – 7 сакавіка.

Токар Кобрынскага рамонтнага завода В. Р. Яшчук – адзіная жанчына ў цэху пнеўмацыліндраў, якая аддала гэтай рабоце больш як 30 гадоў.

**Лучшие** люди Брестчины // Заря. – 1996. – 30 мая. – С. 1 : фот.

О бригадире правильщиков литейного участка Кобринского ремонтного завода А. Гречко.

**Бялова, Н.** Пакуль на адным энтузіязме / Н. Бялова // Кобрынскі веснік. – 1992. – 8 лютага.

Інтэрв'ю карэспандэнта з работніцамі рамонтнага завода аб сацыяльных праблемах жыцця.

**І жыццё –** у радасць, і работа – у ахвоту // Кобрынскі веснік. – 1992. – 29 красавіка. – С. 1.

Пра свідравальшчыка рамонтнага завода У. Астапука.

**Кобринский** ремонтный завод // Заря. – 1992. – 8 января. – С. 3.

**Васюк, Н.** Стачка на рамзаводзе / Н. Васюк // Кобрынскі веснік. – 1991. – 7 мая.

23 красавіка на рамзаводзе прайшла 2-гадзінная забастоўка рабочых.

**Газук, М.** Працоўнай біяграфіі радкі… / М. Газук // Камуністычная праца. – 1990. – 10 лютага. – С. 3.

Рамонтнаму заводу – 50 гадоў.

**Яромскі, М. В**. Эфектыўнасць творчай думкі / [М. В. Яромскі ; гутарыў] І. Сідарук // Камуністычная праца. – 1988. – 29 сакавіка.

**Калинюк, В.** Ремонтники берут подряд / В. Калинюк // Сельская газета. – 1987. – 21 ноября.

Перестройка в организации труда на Кобринском авторемонтном заводе обеспечивает успех дела.

**Бялова, Н.** Кола яе клопатаў / Н. Бялова // Камуністычная праца. – 1986. – 7 кастрычніка. – С. 2.

Двойчы дэпутатам ад рамонтнага завода выбіралася Ганна Мікалаеўна Ладысюк.

**Бялова, Н.** Пошук не спыняецца / Н. Бялова // Камуністычная праца. – 1986. – 8 лютага.

Укараненне брыгаднай формы організацыі працы на рамонтным заводзе.

**Галоўная** лінія // Камуністычная праца. – 1986. – 28 студзеня.

Нарыс аб брыгадзіру рамонтнага завода Р. А. Ясечку.

**Ефимов, А.** Не надо бояться гласности / А. Ефимов // Заря. – 1986. – 3 апреля.

Стропальщик Кобринского ремзавода - о конкретной перестройке производства в связи с поставленными задачами.

**Кукса, М**. «Предлагаю своё решение…» / М. Кукса // Камуністычная праца. – 1986. – 1 апреля.

На инструментальном участке Кобринскоого ремонтного завода работает бригада В. Н. Харевича, все они – рационализаторы.

**Сакалюк, М.** Пачынаць з сябе / М. Сакалюк // Камуністычная праца. – 1986. – 14 жніўня.

Перабудова эканомікі на рамзаводзе.

**Сацук, А.** Майстар па прызванню / А. Сацук // Камуністычная праца. – 1986. – 21 жніўня.

Пра рабочага рамонтнага заваода У. К. Люльковіча.

**Бурдыка, В.** Адзіная прывілегія – быць заўсёды наперадзе / В. Бурдыка // Камуністычная праца. – 1985. – 13 красавіка.

Нарыс аб токару рамонтнага завода П. Д. Селюку, дэлегату XXVI з’езда КПСС.

**Бялова, Н.** Быць наперадзе, весці за сабой / Н. Бялова // Камуністычная праца. – 1985. – 17 жніўня.

**Бялова, Н.** Зацікаўлены ў пошуку / Н. Бялова // Камуністычная праца. – 1985. – 15 судзеня.

**Яромский, М.** Новаторы – пятилетке / М. Яромский // Заря. – 1984. – 13 июля.

**Кукса, М.** Отец и его сыновья / М. Кукса // Заря. – 1984. – 25 мая.

**Ясенка, Р.** За справу бярэцца брыгада / Р. Ясенка // Камуністычная праца. – 1983. – 5 лютага.

**Амельянок, П.** Пачын рабочых / П. Амельянок // Камуністычная праца. – 1982. – 23 студзеня.

**Герка, Н.** Год вялікіх перамог / Н. Герка // Камуністычная праца. – 1982. – 25 лютага.

**Герка, Н.** У промні «пражэктара» / Н. Герка // Камуністычная праца. – 1982. – 4 мая.

Газета рамонтнага завода - адна з лепшых сярод «Камсамольскіх пражэктараў» прадпрыемстваў горада «насценак».

**Дабрагост, І.** Машыны ў страі / І. Дарагост // Камуністычная праца. – 1982. – 12 студзеня.

**Пацяюк, А.** Рабочы характар / А. Пацяюк // Камуністычная праца. – 1982. – 18 сакавіка.

**Тупица, В.** Не формы ради: бригада, разбор практики / В. Тупица // Заря. – 1982. – 17 июля.

**Гупінец, В.** Плён актыўнасці / В. Гупінец // Камуністычная праца. – 1981. – 14 сакавіка.

**Зыбайла, І**. На ўдарнай вахце / І. Зыбайла // Камуністычная праца. – 1981. – 12 студзеня.

На рамонтным заводзе нарастае размах перадз’ездаўскага сацыялістычнага спаборніцтва.

**Зыбайла, І.** Почырк майстра / І. Зыбайла // Камуністычная праца. – 1981. – 28 лютага.

Прафесіянальнае майстэрства наладчыка абсталявання Д. Б. Джумаева высока цэняць у калектыве Кобрынскага рамзавода.

**Лясняк, П.** Побач – настаўнік / П. Лясняк // Камуністычная праца. – 1981. – 6 кастрычніка.

Працоўны шлях слесара-зборшчыка рамзавода кавалера ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга П. Лесняка.

**[На Кобрынскім** рамзаводзе…] // Камуністычная праца. – 1981. – 13 кастрычніка.

Аб працы брыгады па рамонту электраабсталявання.

**Петр** Денисович Селюк, токарь Кобринского авторемонтного завода // Камуністычная праца. – 1981.

**Праводзілі** делегата на з'езд // Камуністычная праца. – 1981. – 21 лютага.

Урачыста праводзілі на XXVI з'езд КПСС токара рамонтнага завода Пятра Дзянісавіча Селюка яго таварышы па працы.

**Романов, В.** Простые истины / В. Романов // Заря. – 1981. - 17 января.

Вся рабочая биография Петра Денисовича Селюка связана с Кобринским авторемзаводом.

**Дарашук, П.** У паходзе за эканомію і беражлівасць / П. Дарашук // Камуністычная праца. – 1980. – 9 лютага.

**Зыбайла, І.** З жаданнем і поспехам / І. Зыбайла // Камуністычная праца. – 1980. – 15 лістапада.

Аб слесары Кобрынскага рамонтнага завода.

**Пятроўская, М.** Уклад рамонтнікаў / Марыя Пятроўская // Камуністычная праца. – 1980. – 9 снежня.

**Філіманюк, А.** Як прыжываецца брыгадная форма працы / А. Філіманюк // Камуністычная праца. – 1980. – 10 ліпеня.

**Яромскі, М.** Плён пошуку / М. Яромскі // Камуністычная праца. – 1980. – 28 чэрвеня.

**Герка, Н.** Магутны рычаг / Н. Герка // Камуністычная праца. – 1979. – 24 лютага.

**Пурко, Д.** Наша гордасць – завод / Д. Пурко // Камуністычная праца. – 1979. – 26 чэрвеня.

**Сялюк, П.** Паўтары сябе у вучнях / П. Сялюк // Камуністычная праца. – 1979. – 13 лістапада.

**Яромскі, М.** У творчым пошуку / М. Яромскі // Камуністычная праца. – 1979. – 12 чэрвеня.

**Астаповіч, А.** Якасць работы – у цэнтр увагі / А. Астаповіч // Камуністычная праца. – 1978. – 24 кастрычніка.

**Емельянаў, В.** Кадрам – пастаянная ўвага / В. Емельянаў // Камуністычная праца. – 1978. – 25 лістапада.

**Селюк, П.** Твоя нравственная позиция / П. Селюк // Заря. – 1978. – 3 марта.

Токарь авторемонтного завода, член бюро Кобринского горкома КПБ П. Селюк - о своём труде.

**Костючук, И.** Для сельских тружеников / И. Костючук // Заря. – 1977. – 28 июля.

**Яромскі, М.** Рацыяналізатары ў пошуку / М. Яромскі // Камуністычная праца. – 1977. – 6 студзеня.

**Емельянаў, В.** У авангардзе – камуністы / В. Емельянаў // Камуністычная праца. – 1976. – 22 чэрвеня.

**Сялюк, П.** Мы – настаўнікі / П. Сялюк // Камуністычная праца. – 1976. – 2 лістапада.

**Яромскі, М.** Дзейнасць завадскіх рацыяналізатараў / М. Яромскі // Камуністычная праца. – 1976. – 27 мая.

**Акімава, В.** Ганаровае права рамонтнікаў / В. Акімава // Камуністычная праца. – 1975. – 5 красавіка.

**Емельянаў, В.** Трыццаць ударных / В. Емельянаў // Камуністычная праца. – 1975. – 6 лютага.

**Акімава, В.** Вялікай душы чалавек / В. Акімава // Камуністычная праца. – 1974. – 1 студзеня.

Аб П. С. Сахарчуку – рабочым рамонтнага завода.

**Булко, Ф.** Ветэран завода / Ф. Булко // Камуністычная праца. – 1972. – 4 студзеня.

Аб ліцейшчыку Кобрынскага рамонтнага завода М. С. Ваўранчуку.

**Емельянов, В.** Ценному почину – поддержку / В. Емельянов // Заря. – 1972. – 4 января.

**Романович, Г.** За счёт новшеств / Г. Романович // Заря. – 1972. – 24 февраля.

Технический прогресс на Кобринском ремонтном заводе.

**Шостак, Д.** Сердцем прописан / Д. Шостак // Заря. – 1972. – 12 августа.

О рационализаторе Кобринского ремонтного завода В. С. Домбрауске.

**Глушко, Л.** Рационализатор, общественник / Леонид Глушко // Заря. – 1971. – 3 июня.

О мастере Кобринского ремонтного завода И. Морозе.

**Рубель, И.** Вторая жизнь деталей / И. Рубель // Заря. – 1971. – 21 апреля.

О работе Кобринского ремонтного завода.

**Шостак, Р.** Доверие / Р. Шостак // Заря. – 1971. – 22 января.

**Булко, Ф.** Кожны дзесяты – рацыяналізатар / Ф. Булко // Камуністычная праца. – 1970. – 30 ліпеня.

**Булко, Ф.** Перадавік вытворчасці / Ф. Булко // Камуністычная праца. – 1970. – 19 снежня.

Аб токары Кобрынскага рамонтнага завода П. К. Дарашчуке.

**Кобрынскаму** аўтарамонтнаму – 30 гадоў // Камуністычная праца. – 1970. – 14 лютага.

**Шостак, Д.** Литейщики / Р. Шостак // Заря. – 1970. – 8 сентября.

Кобринский ремонтный завод.

**Шостак, Д.** Мастерство / Р. Шостак // Заря. – 1970. – 18 декабря.

О слесаре Кобринского ремонтного завода Д. И. Каштелянчике.

**Тут** працуюць рамонтнікі // Камуністычная праца. – 1970. – 15 студзеня.

**Булко, Ф.** Рацыяналізатары падводзяць вынікі / Ф. Булко // Камуністычная праца. - 1967. – 31 кастрычніка. – С. 2.

**Фёдараў, Б.** Галоўны канструктар / Ф. Фёдараў // Камуністычная праца. – 1967. – 24 жніўня.

**Булко, Ф.** Справа рацыяналізатараў / Ф. Булко // Камуністычная праца. – 1964. – 6 мая.

**80 гадоў** з часу заснавання адкрытага акцыянернага таварыства «САЛЕА-Кобрын» (1940) // Зводны каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2016–2020 гг. / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. - Кобрын, 2018. - С. 156–157.

**ОАО** САЛЕО-Кобрин [Электронный рэсурс]. – Режим доступа: http://gidromash.by/. – Дата доступа: 19.02.2020.

**ОАО** САЛЕО-Кобрин [Электронный рэсурс] // Кобринский районный исполнительный комитет. - Режим доступа: http://kobrin.brest-region.gov.by/- Дата доступа: 19.02.2020.

**ОАО** САЛЕО-Кобрин [Электронный рэсурс] // Туристический Кобрин. - Режим доступа: https://ikobrin.ru/ promishlenost-1.php. – Дата доступа: 19.02.2020.

**Открытое** акционерное общество «САЛЕО-Кобрин» [Электронный рэсурс] // Export.by : портал информационной поддержки экспорта. - Режим доступа: https://export.by/company/. - Дата доступа: 19.02.2020.

**Салео**-Кобрин : материал из Википедии — свободной энциклопедии [Электронный рэсурс] // Википедия – свободная энциклопедия. - Режим доступа: https://ru.wikipedia.org/wiki/. - Дата доступа: 19.02.2020.

**Салео**-Кобрин (Гидромаш) [Электронный рэсурс] // Мой Кобрин. Город online. - Режим доступа: https://kbr.by/item/oao-saleo-kobrin/– Дата доступа: 19.02.2020.

**11 лютага** 2020 г. - 80 гадоў з часу заснавання ААТ «САЛЕА-КОБРЫН» (Кобрын, 1940) / матэрыял падрыхтаваны С. Курачук, галоўным бібліёграфам аддзела абслугоўвання і інфармацыі [Электронны рэсурс] // У Календары нашай памяці. – Рэжым доступу: http://krcls.by/ - Дата доступу: 19.02.2020.

**Китай** направит около $79 млн на развитие «Салео-Кобрин» [Электронный рэсурс] // Kobrin City.by : новостной портал Кобрина. - Режим доступа: https://www. kobrincity.by/news/. - Дата доступа: 19.02.2020.

**ОАО** «Салео-Кобрин» один из наиболее значимых инвестпроектов [Электронный рэсурс] // Kobrin City.by : новостной портал Кобрина. - Режим доступа: https://www.kobrincity.by/news/. - Дата доступа: 19.02.2020.

**Сергей** КОВАЛЕВИЧ, директор ОАО «САЛЕО-Кобрин»: «Шанс для себя нашли в кризисе» [Электронный рэсурс] // Вечерний Брест. - Режим доступа: https://vb.by/econom/business/80_let_saleo-kobrin.html. - Дата доступа: 19.02.2020.

**ОАО** «Салео-Кобрин» [Электронный рэсурс] // Оригинальные запасные части. Производство заводов Республики Беларусь. - Режим доступа: https://belzapavto.ru/298-oao-gidromash.html. - Дата доступа: 19.02.2020.

# СПІС
# перыядычных выданняў, матэрыялы з якіх уключаны ў паказальнік

Белорусская нива

Брестский калейдоскоп

Вечерний Брест

Заря

Звязда

Камуністычная праца

Кобрин-информ

Кобрынскі веснік

Народная газета

Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь

Рэспубліка

# ЗМЕСТ

**Ад складальніка** 3

**Гісторыка-эканамічны нарыс** 5

*Вытокі: ад майстэрні да завода* 5

*Дзень сённяшні: новы профіль завода* 11

*Каманда, накіраваная на вынік* 15

**Спіс крыніц** 18

**Спіс перыядычных выданняў, матэрыялы з якіх уключаны ў паказальнік** 38

Даведачнае выданне

# «САЛЕА-Кобрын»: стаўка на экспарт і мадэрнізацыю

***Бібліяграфічны паказальнік да 80-годдзя з часу заснавання ААТ «САЛЕА-Кобрын»***

Камп’ютарная верстка С. Д. Курачук
Дызайн вокладкі П. С. Грыневіч

Надрукавана на камп’ютарна-выдавецкай сістэме
Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэкі
вул. Маршала Жукава, 12,
225301, г. Кобрын, Брэсцкая вобласць